УДК 2-263: 2-67: 316. 422: 2 (476)

# РЭЛІГІЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ ЯК ФАКТАР МАДЭРНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА

**В.А. Адзіночанка**
Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны, adzin28@gmail.com

Магчыма, назва дадзенага артыкула падасца парадаксальнай і не адпавядаючай рэчаіснасці. Звычайна рэлігія разглядаецца як частка традыцыі і кансерватыўны (ад лац. *conservo* -- *ахоўваю, захоўваю*) элемент грамадства, як тое, што садзейнічае захаванню старога, а не вядзе да новага. Нават ва ўмовах сучаснага беларускага грамадства, калі патупова адбываюцца істотныя змены ва ўсіх сферах жыцця (а ў галіне свядомасці яны адчуваюцца ў найбольшай ступені) рэлігія разглядаецца як элемент традыцыі, які трэба адраджаць. Пры гэтым ў залежнасці ад разумення традыцыі разумееецца і характар яе адраджэння, і адпаведна, месца ў ёй рэлігіі.

Найбольш вядомая тэорыя аб антымадэрністскай сутнасці рэлігіі была распрацавана аснавапаложнікам пазітывізму вядомым французскім філосафам А. Контам (1798-1857) у яго знакамітым законе трох стадый развіцця культуры. Згодна з гэтым законам, кожная з ідэй і галін чалавечых ведаў паслядоўна праходзіць тры розных тэарэтычных стану: стан тэалагічны, альбо фіктыўны, стан метафізічны, альбо абстрактны, стан навуковы, альбо пазітыўны. Гэты падыход у далейшым зрабіўся пануючым. Асноўнай характарыстыкай рэлігіі лічыцца тое, што яна з'яўляецца пережыткам і будзе адміраць па меры далейшага кульрнага развіцця.

Не будзем казаць пра неабгрунтаванасць падобных разважанняў. Відавочна, што канцэпцыі XVIII--XIX стагоддзяў, якія сцвяржалі непазбежнасць знікнення рэлігіі, не паддвердзіліся. Нягледзячы на інтэнсіўнае развіццё навукі і тэхнікі ў XX стагоддзі большасць насельніцтва свету, у тым ліку і ў высокаразвітых краінах, у цяперашні час складаюць веруючыя. Таксама і ў нашай краіне, побач з шырокім распаўсюджваннем элементаў цывілізацыі, асабліва на пабытовым ўзроўні, таксама расце і ўплыў рэлігіі. І, хутчэй за ўсё, гэтая тэндэнцыя ў бліжэйшы чыс будзе ўзмацняцца.

Што тычыцца спецыфікі рэлігійнай сітуацыі ў нашай краіне, дык вельмі вялікі ўплыў тут мае марксісцкая трактоўка характару антымадэрнісцкай ролі рэлігіі ў грамадстве. У марксізме рэлігія азначаецца як "опіум народа" (азначэнне Леніна – "род духоўнай сівухі"). Лічыцца, што яна дае ілюзорнае суцяшэнне ў бедах, тым самым адцягваючы ўвагу працоўных ад барацьбы за рэальнае паляпшэнне ўмоў свайго жыцця. Гэтым вызначаецца і рэакцыйная роля рэлігіі – яна садзейнічае захаванню несправедлівых грамадскіх адносін і тым самым служыць інтарэсам пануючых класаў. Рэлігія, згодна з марксізмам, супрацьстаіць прагрэсіўнаму развіццю ў цэлым.

У Савецкім Саюзе рэлігія разглядалася, па-першае, як "адзіная легальна існуючая форма антыкамуністычнай ідэалогіі" і, па-другое, як пережытак старых сацыяльна-эканамічных адносін. Лічылася, што яна паступова знікне, па меры пабудовы справядлівага сацыялістычнага (а ў перспектыве – камуністычнага) грамадства. Усё гэта, безумоўна не выключала неабходнасць антырэлігійнай прапаганды і адміністратыўнах мер па барацьбе з рэлігіяй. Веруючыя у Савецкім Саюзе былі той сацыяльнай групай, якая праследавалася.

У канцы 80-х – пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя стаўленне да рэлігіі з боку ўлад рэзка змянілася. Яна ўжо стала разглядацца як "аснова маралі" і "неад'емная частка нацыянальнай культурнай традыцыі", святароў сталі запрашаць на розныя афіцыйныя мерапрыемствы, яны выступаюць ў школах і вну, дзяржавай аказваецца дапамога ў пабудове храмаў. Але усё гэта мае афіцыйны характар. Рэлігія разглядаецца пераважна як форма ідэалогіі, якая павінна заняць тое месца, якое вызвалілася разам са страціўшай сваё значэнне камуністычнай ідэалогіяй. Прычым, трактоўка рэлігіі адбываецца ў адпаведнасці з марксісцкім падыходам: галоўнай яе функцыяй лічыцца ілюзорна-кампенсатарная – яна павінна даваць суцяшэнне і падтрымліваць чалавека ў яго цяжкасцях. Цікава, што палажэнні марскісцкай ідэалогіі, засвоеныя савецкімі людзмі, з'явіліся арыенцірамі для іх паводзін.

Прыкладна з 1989 года ў Беларусі назіраецца паступовае адраджэнне рэлігіі. Галоўным аб'ектыўным паказчыкам гэтага з'яўляецца рост колькасці рэлігійных арганізацый. Так, за перыяд з 1988 па 2010 гады колькасць рэлігійных суполак павялічылася больш чым у 4 (з 768 да 3106), а рэлігійных кірункаў – у 3 разы. Згодна з сацыялагічнымі апытаннямі, напярэдадані распаду Са-

вецкага Саюзу да ліку няверуючых адносіла сябе каля 65% насельніцтва рэспублікі, а ў 1998 – 25,4%, гэта значыць, амаль у 2,5 разы менш. За гэты ж час амаль удвая вырасла катэгорыя тых, хто лічыць сябе веруючым – з 22 да 37,5%. Аднак гэтыя лічбы не павінны ўводзіць у зман – як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, рэлігійнасць жыхароў Беларусі мае пераважна дэкларатыўны характар: веруючымі зараз называюць сябе прыкладна 50% насельніцтва, у той час рэгулярна наведваюць храмы і выконваюць прадпісанні сваёй рэлігіі не больш 7% насельніцтва. Аднак модным зрабілася дэманстраваць сваю рэлігійнасць. Асабліва распаўсюджанай гэтая мода была ў 90-я гады мінулага стагоддзя, калі на хвалі перабудовы імкнуліся адмовіцца ад усяго савецкага і звярнуцца да іншых каштоўнасцей. У рэлігійнай сферы зараз пануе неакрэсленая духоўнасць, лічыцца, што трэба ў нешта верыць. Большасць беларусаў атаясамлівае сябе з праваслаўем, але размова ў дадзеным выпадку ідзе не аб рэлігійнай, а аб культурнай ідэнтыфікацыі – чалавек заяўляе аб сваёй прыналежнасці да акрэсленай традыцыі. За гады Савецкай улады ў большасці людзей было страчана само разуменне таго, што такое рэлігія. Яна зводзілася, па-першае, да выканання традыцыйных абрадаў (як прыклад: амаль 100% насельніцтва Беларусі і пры камуністах святкавала Пасху) і, па-другое, да сродку суцяшэння чалавека ў яго бедах. Вельмі часта рэакцыяй людзей на змены пачатку 90-х гадоў, якія разбурылі звыклы лад іх жыцця, быў зварот да рэлігіі.

Як паказалі сацыялагічныя даследаванні, прыкладна палова насельніцтва верыць ў варажбу, сурокі і г.д., прычым ў гэта ж верыць і больш паловы людзей, якія лічаць сябе веруючымі. Цікава, што ў гэтыя і падобныя ім рэчы верыць і значная частка людзей, якія лічаць сябе няверуючымі. Такім чынам, на нашую думку, светапогляд і паводзіны большасці насельніцтва Беларусі трэба акрэсліць словам не "рэлігія", але "забабоны". Такім чынам, рэгулюючую функцыю на Беларусі зараз выконваюць не столькі хрысціянскія ці іншыя рэлігійныя арганізацыі са сваім веравучэннем, але стыхійная рэлігійнасць, якая вырастае са штодзённага жыцця людзей. Да гэтага дадаюцца рэшткі вельмі моцнай язычніцкай традыцыі, якая існавала на Беларусі. Напрыклад, значная частка насельніцтва зараз святкуе праваслаўную Радуніцу. Але па тым, як гэта робіцца, можна зрабіць вывад, што гэта – былыя Вясеннія Дзяды ("дзядамі" на Беларусі называюць духаў памёрлых продкаў). Людзі ідуць на могілкі, ядуць там і п'юць і частку ежы і пітва пакідаюць на магілах. Гэта чыста язычніцкі звычай кармлення "дзядоў". Яго рэлігійны сэнс большасць людей зараз не асэнсоўвае, гэта ўспрымаецца як традыцыя. Але, безумоўна, што такія дзеянні знаходзяцца па-за межамі хрысціянства.

Такім чынам, шмат у чым рэлігійнасць беларусаў мае традыцыйны характар, і апроч таго, на яе вельмі вялікі ўплыў аказвае савецкае мінулае. Але сам факт узрастання рэлігійнасці ў краіне, аб'ектыўным паказчыкам чаго з'яўляецца рост рэлігійных суполак – гэта частка абнаўлення грамадства.

Мадэрнізацыя (ад фр. *moderne – новы, сучасны*) – змены, удасканальванне, якія адпавядаюць новым патрабаванням. Зараз дял Беларусі характэрна так званая "даганяючая мадэрнізацыя" – узорам, на які арыентуюцца змены, лічыцца еўрапейскія краіны. Але таксама трэба адзначыць, што тэрыторыя Беларусі доўгі час была часткай еўрапейскай культурнай прасторы, і на ёй адбываліся тыя ж працэсы, што і ў астатняй Еўропе. У галіне рэлігіі гэта, напрыклад, Рэфармацыя, плюралізм рэлігійнага жыцця, наяўнасць традыцыі рэлігійнай талерантнасці. Трэба падкрэсліць, што Беларусь – гэта традыцыйна поліканфесійная дзяржава, на яе тэрыторыі мірна жылі прадстаўнікі самых розных рэлігій. У нас не было сур'ёзных сутыкненняў, а таксама праследаванняў на рэлігійнай глебе. Аб традыцыйнай беларускай верацярпімасці сведчыць, у прыватнасці, і той факт, што на плошчах многіх нашых гарадоў побач стаяць праваслаўная царква, каталіцкі касцёл і іудзейская сінагога.

Плюралізм рэлігійнага жыцця захоўваецца і зараз. У адрозненні ад нашых суседзяў з усходу і захаду, Беларусь не з'яўляецца монаканфессійнай дзяржавай. У нас няма рэлігіі, якая б пераважала. На Беларусі зараз налічваецца 25 рэлігійных кірункаў. Калі выходзіць з колькасці зарэгістраваных рэлігійных суполак, дык найбольш вялікая канфесія – гэта праваслаўе (1509 суполак), але таксама даволі шматколькаснымі з'яўляюцца пратэстанты (хрысціяне веры евангельскай – 501 суполка, евангельскія і хрысціяне баптысты – 272) і каталікі (470 суполак). У гэтых умовах вельмі вялікае значэнне набывае пытанне аб свабодзе сумлення, якая стварае магчымасць для сумеснага існавання і супрацоўніцтва людзей з рознымі поглядамі на рэлігію.

Трэба адзначыць, што працэс мадэрнізацыі прадугледжвае не толькі развіццё рынкавай эканомікі і дэмакратычных палітычных інстытутаў, але і фарміраванне свабоднай асобы. Менавіта наяўнасць апошняй большасцю даследчыкаў разглядаецца як адметная рыса еўрапейскай культуры: у адрозненні ад культур Усходу, дзе чалавек быў часткай надындывідуальных утварэнняў

(племені, суполкі, дзяржавы і г.д.), еўрапейская культура грунтавалася на ідэі свабоднай і актыўнай асобы. Таму зараз адным з фактараў мадэрнізацыі беларускага грамадства з'яўляецца, на наш погляд, ажыццяўленне права на свабоду сумлення.

Права на свабоду сумлення прадугледжвае, што чалавек можа самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, аднаасобна альбо сумесна з іншымі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, яно азначае, што чалавек можа быць прыхільнікам той ці іншай рэлігіі, быць абыякавым да рэлігіі, быць атэістам. Права на свабоду сумлення афіцыйна замацавана ў міжнародных дакументах і заканадаўстве большасці краін, у тым ліку і беларускім. Трэба падкрэсліць, што зараз асабліва актуальнай з'яўляецца менавіта рэалізацыя тых ці іншых правоў чалавека. Бо праз гэтую рэалізацыю адбываецца трансфармацыя грамадства: па-першае, фарміруецца асоба чалавека як актыўны свабодны і самакаштоўны індывід і, па-другое змяняюцца ўзаемаадносіны паміж чалавекам і дзяржавай. Дзяржава перастае быць ўсепранікаючым надындывідуальным інстытутам, які можа распараджацца любымі пытаннямі, і паступова набывае службовы характар.

Трэба адзначыць, што сама ідэя правоў чалавека вырасла з канцэпцыі натуральнага права, якая абвяшчала, што побач з замацаванымі ў законах нормамі існуе яшчэ "непісанае права" якое вынікае з самой сутнасці чалавека. Асновай такога разумення з'яўляецца хрысціянскі светапогляд, згодна з якім ўсе людзі з'яўляюцца прынцыпова роўнымі перад Богам. Першым, хто сфармуляваў капнцэпцыю натуральнага права, быў вялікі хрысціянскі тэолаг Фама Аквінскі (1225 – 1274).

Чакаецца, што ў ходзе далейшага развіцця Беларусі як незалежнай краіны адбудзецца таксама ўзмацнене адметнасцей рэлігійнай сітуацыі, як у краіне ў цэлым, так і ў асобных рэгіёнах. Як прыклад прывядзем дадзеныя па колькасці зарэгістраваных суполак ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях:

| | Назва канфесіі | Брэсцкая вобласць | Гомельская вобласць | Усяго па краіне |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Праваслаўная царква | 366 | 205 | 1509 |
| 2. | Стараверская царква | | 2 | 32 |
| 3. | Рымска-каталіцкая царква | 55 | 17 | 470 |
| 4. | Католікі лацінскага абраду | | | 1 |
| 5. | Грэка-каталіцкая царква | 3 | 1 | 14 |
| 6. | Рэфармацкая царква | | | 1 |
| 7. | Лютэранская царква | | 4 | 27 |
| 8. | Евангельскія хрысціяне-баптысты | 82 | 25 | 272 |
| 9. | Армянская апостальская царква | | | 1 |
| 10. | Іаганская царква | | | 1 |
| 11. | Новаапостальская царква | 3 | 5 | 21 |
| 12. | Пресвітэрыянская царква | | | 1 |
| 13. | Хрысціяне веры евангелькай | 155 | 69 | 501 |
| 14. | Хрысціяне понага Евангелля | 7 | 12 | 55 |
| 15. | Хрысціяне веры апостальскай | 6 | | 9 |
| 16. | Царква Хрыстова | 1 | | 5 |
| 17. | Месіянскія суполкі | 1 | 1 | 2 |
| 18. | Адвентысты сёмага дня | 17 | 12 | 72 |
| 19. | Сведкі Іеговы | 3 | 7 | 26 |
| 20. | Мармоны | | | 4 |
| 21. | Іудзейская рэлігія | 5 | 5 | 30 |
| 22. | Прагрэсіўны іудаізм | 2 | 3 | 16 |
| 23. | Мусульманская рэлігія | 2 | 1 | 25 |
| 24. | Бахаі | 1 | 1 | 5 |
| 25. | Крышнаіты | 1 | 1 | 6 |
| | Усяго | 710 | 371 | 3106 |

Як бачым, агульная колькасць рэлігійных суполак ў Брэсцкай вобласці амаль у два разы больш, чым у Гомельскай. Асаблівую цікавасць выклікае і той факт, што тут у паўтары разы больш праваслаўных суполак. Здаецца павінна было б быць наадварот – Гомельская вобласць

знаходзіцца на усходзе краіны і мяжуе з Расіяй (адна з афіцыйных назваў праваслаўнай царквы на Беларусі – “Беларускі экзархат Маскоўскай патрыярхіі”). Але тлумачынна гэты парадокс тым, што Брэсцкая вобласць у 1921-1939 гадах уваходзіла ў склад Польшчы і тут не было такіх страшных антырэлігійных рэпрэсій 30-х гадоў, як ва Усходняй Беларусі.

Такім чынам, калі мы кажам аб мадэрнізацыі беларускага грамадства, дык трэба ўлічваць спецыфіку нашай гістарычнай традыцыі. Традыцыя (ад лац. *traditio – перадача*) — элементы нацыянальнай і культурнай спадчыны, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення і захоўваюцца ў грамадстве альбо асобных сацыяльнах групах на працягу доўгага часу. Безумоўна, рэлігія – гэта частка нашай культурнай традыцыі. Але трэба падкрэсліць, што культура кожнага рэгіёну мае свае спецыфічныя рысы. Тэндэнцыя да развіцця – гэта неад’емная частка самой еўрапейскай культурнай традыцыі. І таму ўключэнне ў яе, у тым ліку і ў галіне рэлігійнага жыцця, з’яўляецца адным з фактараў мадэрнізацыі нашага грамадства.